Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 15—16 (638—639) Пятніца, 29 красавіка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.

РАБОТНІКІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ, ЗА ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС! РЫХТУЙЦЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВАРТЫХ ЭПОХІ КАМУНІЗМА!

*(З заклікаў ЦК КПСС да 1 мая 1966 года).*




## РАШЭННІ З'ЕЗДА—У ЖЫЦЦЁ

ДНЯМІ прайшоў адкрыты партыйны сход нашага ўніверсітэта. На парадку дня — «Вынікі XXIII з'езда КПСС і задачы партыйнай арганізацыі БДУ імя Ул. І. Леніна». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

Ён падрабязна расказаў аб рабоце XXIII з'езда партыі, аб прынятых з'ездам рашэннях, аб Дырэктывах па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966 — 1970 г. г. Дэлегат XXIII з'езда партыі П. М. Машэраў таксама спыніўся на задачах, якія трэба вырашыць працоўным і вучоным нашай рэспублікі.

— XXIII з'езд партыі, — гаворыць П. М. Машэраў, — выпрацаваў сапраўды навуковую праграму, у якой раскрыты велічныя перспектывы развіцця народнай гаспадаркі СССР. Новы пяцігадовы план заклікан забяспечыць значны рух нашага грамадства па шляху камуністычнага будаўніцтва, далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, умацаванне эканамічнай і абароннай магутнасці краіны.

Выдатных поспехаў дасягнула народная гаспадарка Беларусі. Заданні сямігадовага плана выкананы амаль на восем месяцаў раней тэрміну, а аб'ём вытворчасці ў параўнанні з 1958 годам павялічыўся ў два разы. У БССР створаны новыя галіны прамысловасці: нафтаперапрацоўчая, электронная, мінеральных угнаенняў і іншыя. Звыш 300 буйных прадпрыемстваў і цэхаў уведзена ў дзеянне. Ёсць прыкметныя зрухі і ў сельскай гаспадарцы. Валавая прадукцыя калгасаў і саўгасаў за сямігодку павялічылася ў 1,7 раза. Значна выраслі зборы зерня, бульбы, ільну, цукровых буракоў. Больш чым у два разы зарасла продаж дзяржаве збожжа, малака, мяса і яек. Амаль удвоіліся грашовыя даходы калгасаў, у 2,6 разоў вырасла аплата працы калгаснікаў.

Поспехі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы нашай рэспублікі прывялі да далейшага павелічэння нацыянальнага даходу, росту матэрыяльнага дабрабыту працоўных. Значныя дасягненні беларускага народа і ў вобласці культурнага жыцця. У нас вучыцца кожны трэці чалавек. У краі, дзе да рэвалюцыі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, зараз працуе каля 400 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. У вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах рэспублікі навучаецца 226 тысяч студэнтаў. На кожныя 10 тысяч чалавек у мінулым годзе ў нас прыходзілася 121 студэнт — у два разы больш, чым у Францыі, і амаль у тры разы больш, чым у Італіі і ФРГ. Неўзабаве адкрыюцца новыя вну ў Брэсце, Віцебску.

На XXIII з'ездзе партыі ўказвалася на неабходнасць расшырэння навукова-даследчай работы ў вну, усе народнагаспадарчыя задачы рашаць у цеснай сувязі з дасягненнямі навукі і тэхнікі, выпускаць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Мы ганарымся нашым Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які па праву лічыцца буйным цэнтрам навукі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

Выпускнік вну — гэта заўтрашні спецыяліст. Ён павінен валодаць не толькі спецыяльнымі ведамі, але і арганізатарскімі навыкамі, здольнасцю прымяняць свае веды на практыцы.

Аб гэтым павінен штодзённа памятаць прафесарска-выкладчыцкі калектыў кожнай вышэйшай навучальнай установы.

Другой важнай задачай вышэйшай навучальнай установы з'яўляецца выхаванне студэнтаў у духу марксісцка-ленінскага светапогляду. У гэтым, у першую чаргу, вядучая роля належыць кафедрам грамадскіх навук, аб чым і гаварылася на з'ездзе партыі. У нас пакуль яшчэ ў выкладанні грамадскіх навук не зжыты суб'ектывізм і іншыя недахопы.

Якімі мы будзем выпускаць студэнтаў, у гэтым вялікая роля належыць выкладчыкам. Яны павінны старанна рыхтавацца да кожнай лекцыі, займацца індывідуальным выхаваннем студэнтаў.

Вось чаму з'яўляецца ненармальным, калі некаторыя вучоныя пасіўна адносяцца да выхавання, замыкаюцца толькі ў сваім кругаглядзе навуковых даследаванняў. Дзе ж тут ім запальваць сэрцы моладзі на вялікія здзяйсненні! Другія ж іншы раз праяўляюць лібералізм, заігрыванне са студэнтамі, а некаторыя — нясляваць пачэснае званне выкладчыкаў, што назіралася і ў Беларусім універсітэце. Бываюць яшчэ і такія выпадкі, калі ў аспірантуру трапляюць людзі, няздольныя развіваць навуку.

Абавязак кожнага кіраўніка вну, партыйнай і камсамольскай арганізацыі — выхоўваць усіх юнакоў і дзяўчат дастойнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства і тым самым вырашаць тыя задачы, якія пастаўлены перад імі XXIII з'ездам партыі.

Першым у спрэчках выступіў доктар філасофскіх навук прафесар І. М. Лушчыцкі.

— Кафедры грамадскіх навук, —сказаў ён, —даручылі мне паведаміць аб тых мерапрыемствах, якія павінны быць праведзены па выкананню рашэнняў XXIII з'езда партыі. Нашы кафедры ўжо поўнасцю забяспечваюць чытанне лекцый па ўсіх грамадскіх дысцыплінах, прымаюць меры па перагляду вучэбных праграм, а таксама тэматыкі дысертацый у сувязі з рашэннямі з'езда. За пасляваенныя гады ў нашай вну праведзена вялікая навукова-даследчая работа. Зараз ва універсітэце налічваецца каля тысячы прафесароў, дацэнтаў, выкладчыкаў, больш трынаццаці тысяч студэнтаў, трыста сорак адзін аспірант, толькі ў гэтым годзе наша ўстанова папоўніцца 55 выкладчыкамі з ліку выпускнікоў-аспірантаў. Паказчыкам росту навукі ў Беларускай рэспубліцы з'яўляецца і тое, што з розных гарадоў нашай неабсяжнай краіны прыязджаюць людзі да нас, у Мінск, абараняць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Але ў Беларускім дзяржаўным універсітэце маглі б быць дасягнуты яшчэ лепшыя вынікі ў навукова-даследчай рабоце, калі б ва універсітэце была створана свая база для друкавання навуковых прац аспірантаў і выкладчыкаў. Мы запэўніваем нашу родную партыю, што калектыў грамадскіх кафедраў, натхнёны рашэннямі з'езда, прыкладзе ўсе сілы і веды, каб апраўдаць высокае давер'е партыі і народа.

Выступіўшыя затым дэкан фізічнага факультэта І. П. Зяцькоў, дэкан падрыхтоўчага факультэта М. К. Гарбачоў, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі С. А. Умрэйка, загадчык кафедры матэматычнага аналізу Ф. Д. Гахаў і іншыя вучоныя спыніліся на канкрэтных задачах работы кафедраў, адзначылі, што рашэнні XXIII з'езда партыі з'яўляюцца праграмай нашага руху наперад, яснай перспектывай далейшага развіцця савецкага грамадства.

Удзельнікі адкрытага партыйнага сходу аднадушна адобрылі рашэнні XXIII з'езда КПСС і прынялі пастанову, накіраваную на мабілізацыю ўсяго калектыву ўніверсітэта па паспяховаму ажыццяўленню іх.

**І. ШПАДАРУК.**

### ПАРАДАК КАЛОНЫ ПЕРШАМАЙСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА.

**ФАКУЛЬТЭТЫ РАЗМЕСЦЯЦЦА Ў НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:**

1. ФІЗФАК;
2. ПАДРЫХТОЎЧЫ ФАКУЛЬТЭТ;
3. ФІЛФАК;
4. БІЯФАК;
5. ЮРФАК;
6. ХІМФАК;
7. ГЕАФАК;
8. ГІСТФАК;
9. МАТФАК.

## У СЭРЦЫ—МАЙ!

Май, цёплы, светлы. У вясновым небе прагрымелі першыя ўдары грому. Ласкава свеціць сонца. Яно часцей і часцей заглядвае ў пакоі студэнцкіх інтэрнатаў і аўдыторый нашага універсітэта. На сталах, на вокнах — гваздзікі. Звычайныя жывыя кветкі, кветкі адвагі і надзеі герояў.

Чырвоныя гваздзікі падарылі дэлегатам XXIII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза французскія рабочыя.

Чырвоная гваздзіка — хвалюючы сімвал увагі і кахання ў руках дзяўчыны. Чырвоная гваздзіка ў руках удзельніка першай маёўкі ў Расіі. Чырвоная гваздзіка ў руках Белаяніса, героя Грэцыі, камуніста... Чырвоная гваздзіка — маленькая кропля чырвонага сцягу ў руках студэнтаў нашага універсітэта. Рэвалюцыйныя традыцыі жывуць і памнажаюцца нашай моладдзю.

Май — месяц вясны, месяц гваздзік, свята ўсіх працоўных

І тут я бачу гваздзіку. Яна стаіць на стале побач з невялікай трыбунай, за якой ідзе абарона дыпломных работ студэнтамі-пяцікурснікамі аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта. Сёлета, як і заўсёды, студэнты-журналісты першымі ва універсітэце пачалі «абараняцца», трымаць адказ перад Дзяржаўнай камісіяй, трымаць экзамен на самастойнае жыццё. Хвалюецца кожны. Хвалююцца, відаць, больш тыя журналісты, у якіх дыплом-

(працяг на 2-й старонцы).



Напярэдадні 1 Мая на ўсіх факультэтах нашага універсітэта прайшлі навуковыя канферэнцыі маладых вучоных. Яны з'явіліся далейшай праверкай сіл і старання аспірантаў і студэнцтва ў развіцці навукі. На канферэнцыях было прачытана каля двухсот дакладаў, многія з іх адзначаны прэміямі.

# З ПЕРШАМАЕМ, СЯБРЫ!

# У СЭРЦЫ — МАЙ!



(Працяг. Пачатак на 1-й старонцы).

ная на «вольную» тэму. У Пятра Сушко тоўстая папка. У ёй сабрана яго сатыра і гумар за апошні год. Кіраўнік дыпломнай дацэнт М. Я. Цікоцкі, у якога на рахунку таксама шмат фельетонаў, прапануе Дзяржаўнай камісіі паставіць адзнаку «выдатна».

Цікавая тэма дыпломнай у студэнта М. Герасімовіча «В. Ул. Куйбышаў—публіцыст». Вы бачыце (на здымку ўверсе), як ўдумліва раяцца паміж сабой дэкан філалагічнага факультэта дацэнт Р. В. Булацкі і дацэнт М. С. Зярніцкі. Вопытныя педагогі-журналісты прынцыпова ацанілі даследаванне студэнта.

Хвалюючую радасць здзяйсненняў, светлых спадзяванняў, велічных планаў будучага прынёс Першамай і многім іншым студэнтам. Неабмежаваная радасць у гэтых трох юнакоў (здымак справа). Рознымі шляхамі прыйшлі яны вучыцца ва універсітэт. Самаліец Ахмед Гома (злева), Ганец Даніэль Кофі і беларус Валерый Кірыліца. Братэрская дружба, сяброўства звязала іх назаўжды. Валерый Кірыліца заўсёды знаходзіць вольную хвіліну, каб дапамагчы ім у вучобе. Шмат расказвае пра жыццё нашага народа. А студэнты Даніэль Кофі і Ахмед Гома ў сваю чаргу пра свае сонечныя краіны, легенды і звычаі народаў Афрыкі. Таму, відаць, так многа ведаюць як нашы студэнты, так і замежныя пагаворак, прыказак, песень розных народаў свету на іх родных мовах. Гэта адзін з нямногіх прыкладаў сапраўднага сяброўства, роўнасці і таварыскасці. Нездарма Першамай — гэта радасныя ўсмешкі братэрства, сусветная пераклічка пралетарскіх сэрцаў.

Яркае вясновае сонца. Сінее, сінее неба. У цяперашнія дні горад становіцца гігантцкім стадыёнам. Спрачаюцца бегуны, узлятае над сеткай валейбольны мяч, цэлыя арміі веласіпедыстаў імкнуцца выехаць за горад, каб зрабіць вялікі прабег. Многа Першамай прынёс стартаў. Таму і многа радасных фінішаў у студэнтаў нашага універсітэта. Асаб-

(Заканчэнне на 3-й старонцы).

# СА СВЯТАМ, САВЕЦКІЯ СЯБРЫ!

Многім замежным студэнтам цяжка даецца руская мова. Раней мы яе не вывучалі. А тут, на падрыхтоўчым факультэце, трэба ёю авалодаць за адзін навучальны год так, каб можна было ў далейшым слухаць лекцыі, чытаць спецыяльную літаратуру, пісаць. На рускай мове даводзіцца ўжо на падрыхтоўчым факультэце вывучаць фізіку, матэматыку, хімію, курс «Савецкі Саюз», біялогію, эканамічную геаграфію СССР.

І нездарма мы ўзрадаваліся, калі на дапамогу да нас прыйшлі студэнты філалагічнага факультэта: Марына Мацюхіна, Рая Кляўдо, Лілія Фядотава, Эля Кузняцова.

Сальвадор Насія з партугальскай Гвінеі, студэнты з Мазамбікі, Жэрар Мзабітамазабо з Бурундзі і многія іншыя не прапусцілі ніводных заняткаў, якія праводзілі з намі савецкія сябры. Нам вельмі прыемна, што побач з намі савецкія сябры.

Мы чулі, напрыклад, што калісьці на нашым падрыхтоўчым факультэце вучыўся кенійскі студэнт Паўль Кімані. Ён марыў паступіць у медыцынскі інстытут. Але хлопцу цяжка давалася хімія. А без хіміі будучы ўрач не можа абыйсціся. Хлопец ужо пачаў траціць веру ў свае сілы... Але на дапамогу да яго своечасова прыйшла студэнтка-камсамолка з хімфака Света Осіпава. Па некалькі гадзін кожны дзень займаліся яны па хіміі, рашалі задачы, разглядалі хімічныя рэакцыі, формулы.

Пауль Кімані паспяхова здаў усе выпускныя экзамены і паступіў у Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, дзе і займаецца зараз. Вучыцца паспяхова, часта забягае да нас, у інтэрнат, на падрыхтоўчы факультэт.

Некаторым з нас таксама цяжка даецца хімія. Але студэнты-хімікі не пакінулі нас у бядзе. Марыя Вайцекян дапамагае кенійскаму студэнту Джошуа Ачуоньё, Галя Мільто — студэнтам з Мазамбіка, Ларыса Бязручанка — студэнтам з Паўднёва-Заходняй Афрыкі, Галя Маеўская — студэнтам з Танзаніі. Вельмі ўдзячны замежныя студэнты і Людміле Патапавай, Галіне Мажэйка і іншым студэнтам хімічнага факультэта.

З выпадку першамайскіх свят мы дзякуем савецкім сябрам за іх братэрскія клопаты аб нас, віншуем ад усяго сэрца іх з 1 Маем— святам вясны, міру, шчасця, жадаем усім нашым савецкім сябрам выдатных поспехаў у вучобе. Са святам вас, дарагія таварышы!

**П'ер Н'янкі,**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта.**



# ПЕРШАМАЙ У НАС, У В'ЕТНАМЕ

*Наступае доўгачаканае свята — Першамай. Горача і сардэчна віншуем вас, савецкія браты са святам згуртаванасці ўсіх працоўных свету ў барацьбе супраць агрэсіі імперыялізму, за мір, нацыянальную незалежнасць і сацыялізм.*

*Першае мая для нас, в'етнамцаў, азначае і дзень перамогі над французскімі каланізатарамі дванаццаць год таму назад пад Д'ен-Б'ен-Фу. У выніку гэтай перамогі мы атрымалі часовую перадышку.*

*Але цяпер зноў наша зямля гарыць ад узрываў бомб і напалму, байцы мужна абараняюць нашу радзіму і недалёка той дзень, калі амерыканскія агрэсары будуць разгромлены.*

*У гэтым годзе, адзначаючы 1 Мая, тысячы нашых юнакоў і дзяўчат, увесь народ, па закліку нашай роднай партыі, з вялікім энтузіязмам працуюць на карысць радзімы, і заўсёды гатовы са зброяй у руках стаць на абарону сваёй зямлі.*

*Усебаковая падтрымка Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін, усяго міралюбівага чалавецтва мацуюць нашу сілу і натхняюць нас на справядлівую барацьбу.*

*Зараз мы вучымся ў савецкіх братоў і разам з імі адзначаем 1 Мая сваімі поспехамі ў вучобе.*

*Мы ніколі не забудзем старанні савецкіх выкладчыкаў, каб падрыхтаваць нас высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Абяцаем нашым савецкім сябрам яшчэ больш старанна авалодваць ведамі, каб пасля заканчэння вучобы быць сапраўднымі будаўнікамі сацыялізма ў нашай краіне.*

*Яшчэ і яшчэ раз віншуем вас, нашы сябры, з Першамаем, жадаем добрага здароўя і поспехаў у вучобе, поспехаў у пабудове камунізма.*

**До-Ван-Мао.**

# МАЯ ЗЯМЛЯ

**Шмат камсамольцаў нашага універсітэта неўзабаве паедуць на цалінныя будоўлі. Уладзімір Вялічка, студэнт аддзялення журналістыкі, быў камандзіраваны камітэтам камсамола ў Казахстан, азнаёміўся з мясцінамі, дзе будуць працаваць пасланцы нашага універсітэта, а таксама заключыў працоўныя дагаворы з калгасамі і саўгасамі.**

**Нядаўна ён вярнуўся з цаліны і падзяліўся сваімі ўражаннямі.**

Павольна плыве лодка па хвалях магутнага Урала. Амаджан Хамзінаў лоўка валодае вёсламі. Я знаёмы з ім яшчэ з мінулага года.

— Зноў да нас? — пытаецца ён.

— Але! — усміхнуўся я...

— Рады сустрэць далёкага госця...

Аманжол гаворыць павольна, у вачах — радасць. У мінулым годзе студэнты нашга універсітэта пабудавалі яму саманавы трохпавярховы дом, разам адсвяткавалі наваселле. А пасля часта наведваліся сюды — слухалі казахскія былі, апавяданні пра гераічную барацьбу чапаеўскіх герояў. У адным з баёў загінуў брат Аманжола Тэльман, які змагаўся ў Чапаеўскай дывізіі...

Непрыкметна мы падплылі да скверыка. На некаторы час спыняемся і глядзім на абеліск, высечаныя на ім словы: «5-га верасня 1919 года тут загінуў легендарны Герой грамадзянскай вайны Васілій Іванавіч Чапаеў».

Урал забірае ўправа. Вакол— стэп і стэп. Раскіслая зямля злёгку дыміць, быццам напрасаваная. Дабрацца ў далёкі пасёлак можна толькі на лодцы або на верталёце...

Праз некаторы час мы ўжо пілі чай. Такі казахскі звычай— абавязкова пачаставаць госця чаем. Гаспадар расказвае пра цікавыя казахскія гісторыі; я— пра Мінск, універсітэт, пра нашы калгасы і саўгасы. Дачка пастуха ўключыла радыёлу, і мы дружна запелі студэнцкую песню...

Назаўтра, як толькі пачала цадзіцца ў вокны раніца, мы накіраваліся далей. Да саўгаса было рукой падаць.

## КРЫХУ ГІСТОРЫІ

Над бескрайнім стэпам узыходзіць сонца. Да 10—11 гадзін узнімаецца вецер, нясе пыл. І так кожны раз. А пакуль што прыемная прахлада ахінае стэп.

Машына пакідае грэйдэр. Над будоўляй уецца чырвоны сцяг, з беларускім арнаментам. Гэта сімвал атрада. Сімвал студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Толькі што наступіла раніца. Усе на нагах. Будоўля ажывае. Камандзір фізікаў Іван Цвірко сказаў коратка.

— Да ад'езду застаюцца лічаныя дні. Трэба закончыць... Байцы цаліннага семестра добра разумеюць гэтыя словы. Закончыць і толькі, інакш нельга... Калі трэба, будзем працаваць дзень, суткі, двое. Хлопцам не прывыкаць да цяжкасцей. Таму і спакойны камандзір. За тры гады яны пакінулі аб сабе добрую памяць:

Год 1963 — пабудаван жывёлагадоўчы гарадок ў саўгасе «Алгабаскі».

Год 1964 — пабудавана новая вуліца ў саўгасе «Блішчанскі».

Год 1965 — пабудавана цэнтральная сядзіба ў саўгасе Калінаўскі з памятнай вуліцай — Універсітэцкая.

І такіх прыкладаў дзесяткі. Прыкладаў сапраўднай мужнасці, камсамольскай загартоўкі, вытрымкі.

Напружаным быў мінулагодні цалінны семестр. Пяць мільёнаў шэсцьсот тысяч рублёў! Столькі трэба было асвоіць Уральскаму абласному студэнцкаму атраду. Здавалася, што непераадоленае задумалі пераадолець гэтыя хлопцы.

10 гадзін работы. У сярэдзіне цаліннага семестра стала відавочна, што задуманае па плячу. Тады запылаў агеньчык другога этапа спаборніцтва. Яго ініцыятары — Джам Бейтыкскі і Чапаева — Тайпакскі раённыя атрады. Ударная вахта праводзілася пад дэвізам: «Даеш зверх плана 1,5 мільёна пры 100 планавым уводзе аб'ектаў у эксплуатацыю, пры дабраякасным выкананні будаўнічых заданняў і высокай арганізацыі працы!»

Зноў над стэпам пранеслася хваля працоўнага пад'ёму. З кожным днём шырыўся размах будаўніча-мантажных работ. Поўнае засваенне на студэнцкім фронце дасягнула 7,5 мільёнаў рублёў. Абавязацельствы перавыкананы на 1,9 мільёнаў. Важна адзначыць і тое, што усё

# ПАД НЕБАМ СІНІМ, ГАЛУБІНЫМ

*Юрка Голуб*

## МАЯ РАДЗІМА

Мая Радзіма — край бусліны.
Птушак і людзей аэрадром.
Махае ўслед касынкай сіняй
Зяльвянка пад маім крылом.

А калі ў воблачных вышынях
Трацілам разгараецца гром,
Хоць згару! —
Любоўю, што не стыне,
Палячу на свой аэрадром!

## НАЧАМІ МНЕ СНЯЦЦА КАСТРЫ...

Дагарае счарнелы ствол,
А іскры лятуць у вечнасць!

Згаралі бацькі да тла
У муках вялікіх свечкамі.
Цяпер жа нам да святла
Іх сэрцамі шлях асвечаны.

Начамі мне сняцца кастры,
З ног збівае крыламі полымя!
Іскры з сухіх кастрыц
Узлятаюць на неба поўнямі.

З людзьмі ў кастроў радства.
Агонь — чырвонае веча!

Каб шторм у душы не сціх,
Са слова агеньчык пырскаў,
Мы будзем што сіл існіці,
Хоць, мо, і згарым, як іскры!

*Галіна Панько*

Прыдзеш дужы, вясёлы,
Прыгожы.
І дзявочы спакой
Устрывожыш.
На марозе застылыя
Рукі
Мне сагрэеш сваім
Пацалункам.
Дзе ж ты ходзіш так доўга,
Каханне!
Я замёрзла зусім
У чаканні.

*Іван Станкевіч*

*Сонца піло ваду*
*Промнямі,*
*Як праз саломінку.*
*На зямлі*
*Сухата*
*Пякучая.*
*На зямлі*
*Цішыня*
*Траскучая.*
*Поўдзень звінеў*
*Сухой цішынёй.*
*Промні перасушаныя*
*Ламаліся,*
*Таму траскучая*
*была*
*цішыня.*
*О, Зямля.*
*Не ведай*
*Сухмені!..*

## МАРЫ НАСУСТРАЧ...

*Празвінеў званок. У калідорах школы змоўк шум. У 11 класе рабяты пішуць сачыненне. Тэма яго цікавая «Кім я хачу быць?». Гэта сачыненне не ў трэцім класе, калі адзін малыш піша, што ён хоча быць мараком, другі—лётчыкам, а трэці—касманаўтам. Тут на паперу кладуцца думкі людзей, якія праз некалькі дзён выйдуць у самастойнае жыццё.*

*Разам са сваімі таварышамі пісала гэтае сачыненне і Тоня Гурко. Тады ў яе і з'явіліся на старонцы сшытка радкі: «Я хачу быць біёлагам!» Што гэта? Мара? Так, гэта была мара. І дзяўчына настырна стала дабівацца яе здзяйснення. Тоня наведвае падрыхтоўчыя курсы, якія былі арганізаваны пры біялагічным факультэце нашага універсітэта.*

*І вось ужо здадзены экзамены за сярэднюю школу. На выпускным вечары пад дружныя апладысменты Тоні Гурко быў уручаны атэстат сталасці са срэбным медалем...*

*Па ўмовах конкурса ёй трэба было здаваць толькі адзін прадмет—хімію. Месяц напружанай працы даў свае вынікі. Радасная і ўсхваляваная выйшла Тоня з аўдыторыі, дзе прымаліся ўступныя экзамены. У экзаменацыйным лісце стаяла «выдатна».*

*Так пачалася для Тоні студэнцкае жыццё. Ва універсітэце Тоню выбралі членам камітэта камсамола факультэта, загадчыкам піянерскага сектара, які шэфствуе над сорак сёмай школай. Вольнага часу ў студэнта-біёлага мала, але Тоня заўсёды знаходзіць час, каб пабываць у школе. З радасцю сустракаюць яе рабяты. І гэта не дзіва! Тоня і яе сяброўкі В. Акулава, Т. Янчанка, Т. Клімава і В. Жук заўсёды раскажуць ім шмат чаго цікавага.*

*Грамадская работа зусім не перашкаджае Тоні вучыцца на «выдатна». Мінулую сесію яна здала толькі на адны пяцёркі. За выдатную вучобу і грамадскую работу Тоня Гурко ў міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка была ўзнагароджана каштоўным падарункам.*

*Высокая прынцыповасць і таварыскасць—вось галоўныя рысы яе характару. Студэнты курса, ды і ўсяго факультэта, паважаюць і ганарацца сваёй сяброўкай.*

*Як і ў многіх дзяўчат, у Тоні таксама ёсць любімая справа. Яна вельмі любіць спяваць. А спявае яна ўсё: і арыі з опер, і эстрадныя, і рускія народныя песні. Ні адно выступленне нашай мастацкай самадзейнасці не праходзіць без Тоні.*

*В. ДОБКІН,*
*студэнт першага курса аддзялення журналістыкі.*

*Міхась Губернатараў*

* * *

**Радзіма, край мой сакаліны,**
**Бяроз вячыстых і дубоў.**
**Як пераплецены галіны,**
**Так да цябе мая любоў.**
**Пад небам сінім, галубіным,**
**Дзе радасць сонечная б'е,**
**Я шчырай думкай штохвілінна**
**Жыву заўсёды аб табе.**
**Настой лугоў тваіх мядовых,**
**Крыніц наструнены бальзам...**
**Дзе адшукаць мне тыя словы,**
**Каб слова ўдзячнасці сказаць.**
**На звон падобнае крыніцы,**
**На пошум дуба і бяроз.**
**Тваімі промнямі іскрыцца,**
**Табой асветлены мой лёс.**

* * *

**А, здаецца, хмара ўжо вісела**
**На танклявых зубчыках грабель.**
**Асыпаў не зоркамі, а сенам**
**З галавой, каханая, цябе.**
**Уцякаў ад лівневага звону,**
**А папаў—у полымя і май,**
**Калі ты ў гарачыя далоні**
**Воблачкам спусцілася сама.**

*Мар'ян Дукса*

## БЕЛЫЯ САДЫ

Я не садоўнік, і на гэтым—клямка!
У справе садаводства я ні-ні.
Не знаю, так ці не ў гэту ямку
Я апусціў густыя карані.
Шчаслівa, яблынька! Расці высокай;
А перад тым—ні пуха, ні пяра!
Няхай жыццёвым варухлівым сокам
Напоўніцца зялёная кара.
І станеш ты прыгожай і вячыстай.
І раніцаю ля тваіх галін.
Засерабрыцца лісце лапушыстае —
І зацвіцеш... на добры ўспамін,
Што меў і я калісьці дваццаць.
Была вясна навокал. І тады
Гудзелі пчолы і маё юнацтва
Было такім, як белыя сады.

*Алесь Камароўскі*

## ЁСЦЬ РАЧУЛКА



Ёсць рачулка маленькая Ловаць.
Ноччу зоры там невадам ловяць
Ціш зялёную. А раніцой лотаць
Пачынае пялёсткамі лопаць.
Прыгажосць у русалчыным выглядзе.
На ваду месяц—лодачку вывядзе,
На сярэдзіну самую выедзе—
Зорка з косаў у рэчку выпадзе.
Аняменне растане лёгкае:
Рэха спелае і далёкае
Рвецца, б'ецца, па лесе лётае,
Як лясун адзічэлы, галёкае.
А падкрадзецца свежая раніца —
Салаўі закаханыя раяцца,
Іх прызнаннямі сэрцы раняцца...
Плешча песняй зарослая старыца.
Я стаміўся, ды цягне прыкметна
Ловаць, што салаўямі апета,
Каб знайсці між сцяжынак і кветак
Прыгажосць, ціш зямную і лета.
Ёсць рачулка маленькая Ловаць...
Там рамантыкі мора ловяць.
Там, каханай паднёсшы лотаць,
Ты адчуеш даверлівы локаць.

## ДЗЯЎЧЫНА

А сонца—па заказу,
А ранак сіні-сіні,
А лета хмель адразу
Зноў выпілі асіны.
А пад бярозай змлелай
На ўтоптаным гасцінцы
Стаіць дзяўчынка ў белай
Раскрыленай хусцінцы.

У кошыку — грыбочкі,
На дне — букецік кветак:
Дзяўчынка ў лясочку
Збірае сёння лета.
Дзяцінства праляцела
Па ўтоптаным гасцінцы
Дзяўчынкаю ў белай
Раскрыленай хусцінцы.

## Касманаўт

Недзе войны вядуць каралі,
Касманаўту ж не спіцца начамі:
На міжзоркавым караблі
Давядзецца мо, заўтра адчаліць.
Давядзецца мо, песпех мець—
І на кожнай старонцы газеты
Яго імю тады грымець
Небывалым цудам сусветным.

І ён прыйдзе да нас тады,
Просты і чалавечны,
Каб у вершах праз дні і гады
Назаўсёды прайсці ў Вечнасць.
Потым стане і з-пад рукі
На прасторы паглядзіць толькі,
А да ног упадуць васількі —
Недалёкага неба асколкі.

## МАРЫНА, МАРЫНА, МАРЫНА!

Медык... Якое гэта многазначнае слова! Гаворым яго і ўяўляем мноства людзей у белых халатах, якія штодзённа змагаюцца за жыццё чалавека, за яго здароўе. Невялікая чарга ў кабінеце зубнога ўрача. Але на гэты раз я прыйшла да яе не за дапамогай. А пагаварыць пра яе работу, жыццё, клопаты. Я так многа добрага чула пра яе, асабліва ад дзяўчат студэнцкіх інтэрнатаў.

У дзяцінстве Марына аб прафесіі ўрача не марыла. Але давялося працаваць санітаркай у трэцяй клінічнай бальніцы горада. З той пары яна палюбіла ўсім сэрцам гэтую нялёгкую прафесію. Марына палюбіла гэтыя бясконцыя турботы, жаданне быць побач з хворым, дапамагчы чалавеку.

І вось пасля доўгай і старанней падрыхтоўкі яна паступіла ў медыцынскае вучылішча без адрыву ад вытворчасці. Пасля заканчэння вучобы прыйшла працаваць ва універсітэт медыкам.

Дружны калектыў сустрэў яе па-сяброўску, дапамог практычна авалодаць неабходнымі ведамі.

— Марына Галубовіч — вопытны ўрач. А калі ўлічыць яе прыемныя адносіны да кожнага з нас, то можна з упэўненасцю сказаць, што прыходзіш лячыцца да яе з прыемнасцю, — гавораць мне пра яе наведвальніцы...

Летась Марына Галубовіч працавала ў студэнцкім спартыўным лагеры на возеры Нарач. І адтуль прывезла толькі падзякі.

Даўнішняя мара дзяўчыны — паступіць вучыцца на біялагічны факультэт нашага універсітэта. Цяпер яна студэнтка вячэрняга аддзялення.

Нялёгка прыходзіцца Марыне, але побач яе сябры, яны ёй заўсёды дапамагаюць

**О. БАНДАРЭНКА.**

**Нам. рэдактара**
**П. ТКАЧОЎ**

АТ 00892 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. № 621.